# ПАЛІТЫКА ФРАНЦУЗСКІХ АКУПАЦЫЙНЫХ УЛАД НА БАРЫСАЎШЧЫНЕ ПАДЧАС ВАЙНЫ 1812 Г.

*УА “Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт інфарматыкі і радыёэлектронікі”*
*г. Мінск, Рэспубліка Беларусь*

*Бельская Г.С.*

*Мікалаева Л.В., к.г.н., дацэнт*

Даклад асвячае малавядомую старонку гісторыі аднаго з рэгіёнаў Беларусі падчас вайны 1812 г.

24 чэрвеня 1812 г. французская армія і яе саюзнікі перайшлі дзяржаўную мяжу Расійскай імперыі, распачаўшы такім чынам вайну. Поспеху Напалеона ў першапачатковы яе перыяд спрыяла тое, што мясцовая шляхта ўспрымала яго як вызваліцеля і гаранта адраджэння Рэчы Паспалітай. Яна дапамагала французам ва ўсім. Чаго нельга сказаць пра простае насельніцтва.

Так як Барысаў не быў падрыхтаваны да абароны, мясцовы рускі гарнізон на чале з камендантам Грэсарам 13 ліпеня адыйшоў да Бабруйска. У той жа дзень для аховы Барысава і сустрэчы французаў была ўтворана камісія, у якую ўвайшлі прадстаўнікі мясцовай шляхты. Сярод іх былі такія паважаныя ў павеце людзі, як О. Валовіч, О. Слізень, П. Тышкевіч. Абавязкі паліцмайстара былі ўскладзены на гарадскога суддзю І. Норвіда, а насустрач французскаму атраду да Жодзіна быў пасланы адвакат Віткоўскі. Сустрэўшы французаў, ён паведаміў ім аб адсутнасці рускага войска ў Барысаве. Увечары, каля шасці гадзін, у горадзе ўжо размяшчаліся французы. На наступны дзень з той нагоды праходзілі ўрачыстасці, што ладзіліся мясцовай шляхтай.

Дзеля кіравання паветам, які ўвайшоў у склад “адноўленага” ВКЛ, 13 ліпеня была ўтворана павятовая камісія. Акрамя І. Норвіда, О. Валовіча, О. Слізеня і П. Тышкевіча, у яе склад быў уведзены Р. Корсак. Камісія складалася з харчовага, фінансавага і паліцэйскага аддзелаў. Кантраляваць выкананні яе рашэнняў на тэрыторыі павета прызначаліся падкамісары. Французскія акупацыйныя ўлады у той жа час правялі адміністратыўны падзел нашых земель на свой узор. Замест павета імі была ўтворана падпрэфектура. Барысаўская падпрэфектура, якую ўзначальваў падпрэфект М. Зяновіч увайшла ў склад Менскага дэпартамента. Яна была падзелена на 11 кантонаў на чале з падкамісарамі. З чатырох кандыдатур, спіс якіх падпрэфект падаваў у дэпартамент, зацвярджаліся два яго памочнікі. Павятовая камісія таксама была ўведзена ў яго падпарадкаванне. У той жа час перад павятовай камісіяй за кіраванне горадам адказваў прыйшоўшы на змену управе магістрат. У ім было тры аддзелы: паліцэйскі, работу якога накіроўваў старшыня муніцыпалітэта, гаспадарскі і кватэрны, якімі кіравалі два памочнікі старшыні.

Дзеля сварэння спрыяльных умоў жыцця Менскім дэпартаментам 15 ліпеня было прынята рашэнне аб рамонце ў нашым краі млыноў, такіх неабходных для забеспячэння насельніцтва і арміі мукой. У сувязі з неабходнасцю падтрымання на тэрыторыі Менскага дэпартамента належнага парадку, на наступны дзень была прынята пастанова аб утварэнні жандармерыі.

Вялікая колькасць французскага войска, што праходзіла праз Барысаў, а з 14 па 23 ліпеня іх тут пабывала каля 60000, выклікала назначэнне сюды ваеннага каменданта. З 20 ліпеня ім стаў генерал Барбанегер (Барбанегр), якому былі падпарадкаваны як павятовая камісія, так і падпрэфектура. Ужо на наступны дзень павятовая камісія атрымала загад аб адкрыцці ў горадзе, дзеля захоўвання для арміі Напалеона запасаў прадуктаў, харчовага магазіна. У яго, згодна нормам харчовага збору, мясцовае насельніцтва павінна было здаць 415 бочак ячменнай або грэцкай мукі, 2306 бочак жытняй, 4604 бочкі аўса, 52316 пудоў сена і столькі ж саломы, 35020 фунтаў солі, а таксама 14526 літраў гарэлкіі 1725 валоў. Да тых, хто не здаваў сваю долю ў трохдзённы тэрмін, накіроўвалі “для экзэкуцыі” чатырох салдат. За кожны дзень затрымкі пагашэння павіннасці “вінаваты” павінен быў плаціць салдатам па 12 злотых і забяспечваць у такія дні за свае сродкі іх утрыманне. Такія ж магазіны былі створаны па ўсяму нашаму краю. Палову харчовага збору павінны былі забяспечваць сяляне, якім ад усяго ўраджаю было дазволена пакінуць сабе толькі трэцюю яго частку. Другую ж палову збору ўносілі землеўладальнікі. Да тых, хто не мог уласнымі сіламі сабраць ураджай, на дапамогу накіроўвалі вайскоўцаў і рамеснікаў з мястэчак і Барысава.

Акрамя забеспячэння прадуктамі харчовых магазінаў, з насельніцтва патрабавалі паставак прадуктаў і дроў у лазарэт і шпіталь. Калі ўлічваць, што ў нашым краі знаходзілася каля 150000 чалавек акупацыйнага войска і шпіталь на 2000 ложкаў не пуставаў, то на кожнага з 45590 тагачасных жыхароў Барысаўшчыны прыпадала па тры ўтрыманцы. У дадатак да таго, з насельніцтва яшчэ збіраліся і грошы. Яны ішлі не толькі на падтрымку акупацыйных органаў улады, а і на ўтрыманне войска і жандармерыі ВКЛ. Набор у войска праходзіў з цяжкасцю: замест амаль 500 жаўнераў Барысаўшчына змагла паставіць толькі каля 180. Крыху лепей праходзіла фарміраванне жандармерыі, у якую замест 107 чалавек было набрана 70. Але з іх было толькі 19 конных.

У пачатку верасня 1812 г. па загаду новага ваеннага каменданта Барысава Міхода. які 18 жніўня змяніў на той пасадзе генерала Барбанегера, патрабаваў адкрыць яшчэ адзін харчовы магазін, а той, які ўжо існаваў— папоўніць прыпасамі. У кожным з іх, акрамя 100 бочак мукі і 10 валоў, павінны былі быць печкі для выпечкі хлеба. Да ўсё ўзрастаючых аб’ёмаў розных відаў збораў з насельніцтва, 19 верасня Менскім дэпартаментам была ўведзена яшчэ адна агульная працоўная павіннасць: штодзённа мясцовыя ўлады павінны былі прадстаўляць для розных работ 200 чалавек. Калі іх патрабавалася болей, то за дапамогаю звярталіся да ўладаў суседніх кантонаў. У прыватнасці, на рыцці маставых умацаванняў у Барысаве працаваў не толькі мясцовыя жыхары, а таксама і людзі са Шклянскага кантона.

Такім чынам, усе пералічаныя формы ўціску на насельніцтва не спрыялі добразычлівым адносінам мясцовага жыхароў да французаў, якія яшчэ займаліся і марадзёрствам, т.л. і ў маёнтках сваіх прыхільнікаў. У такіх абставінах частка насельніцтва вымушана была пакінуць сваё жытло і сыходзіць у лясы. Каб як-небудзь пракарміцца, людзі былі вымушаны нападаць на французскія абозы, харчовыя магазіны, а таксама на маёнткі сваіх і суседніх памешчыкаў. Расло узброеная супраціўленне акупантам.